# БРЫЛЬЯНТ У ІНТЭЛЕКТУАЛЬНЫМ СВЕЦЕ

**Узвядзенне унікальнага будынка Нацыянальнай бібліятэкі ў выглядзе брыльянта пачалося у Мінску у лістападзе 2002 года. І ўжо набліжаецца да завяршэння. "Брыльянт" ужо красуецца ў канцы праспекта Незалежнасці. Яго застаецца апрануць ў святочную шкляную "кашулю".**

Цяжка паверыць, што ўзначаліць гэты незвычайны праект узяла на сябе смеласць жанчына, галоўны інжынер праектаў інстытута "Мінскпраект" Людміла Шохіна. Асоба не менш унікальная, чым сама будучая бібліятэка. Наўрад ці вы знойдзеце ў Беларусі спецыяліста, які прапрацаваў у праектным інстытуце 40 гадоў і пабудаваў 105 аб'ектаў сталіцы, сярод якіх нямала культавых. Толькі вельмі моцнаму чалавеку пад сілу несці такую адказнасць столькі гадоў. Паспрабуем разгадаць, як гэта ў яе атрымліваецца.

*— Людміла Мітрафанаўна, пагадзіцеся, што жанчына, якая кіруе такім агромністым і адказным будаўніцтвам, Ьля сённяшняй Беларусі — з'ява тыповая...*

— У тэхнічных прафесіях, звязаных з матэматыкай, і цяпер жанчын не вельмі многа. Прынята лічыць, што ў жанчын гуманітарны склад розуму. Але я мяркую, што справа ў характары. І, магчыма, у генах. Мая мама, напрыклад, у дзяцінстве часта мне казала: "Ты ўся ў бацьку! Цябе не зломіш!" "Хачу" — з дзяцінства мой галоўны матор. Пасля інстытута я два гады працавала на Камчатцы. Самымі папулярнымі героямі ў нас былі альпіністы і вулканолагі. Я не была фізічна падрыхтавана да альпінізму. Але мне вельмі хацелася падняцца з імі ў гары. І я падымалася. Матэматыка мяне заўсёды прываблівала больш, чым гуманітарныя навукі. Яшчэ ў школьныя гады я крыху заікалася. І каб пераадолець гэта, вылечыцца і знайсці яшчэ адзін спосаб творчай самарэалізацыі, прымусіла сябе пайсці ў народны тэатр. І перастала заікацца. Думаю, што галоўная рыса майго характару — мэтанакіраванасць.

*— Можа, вас выхоўвалі нейкім асаблівым чынам?*

— Мне здаецца, мяне ўвогуле ніяк не выхоўвалі. У тым сэнсе, што нічога не забаранялі. Я была наравістым, але і адказным дзіцем. І бацькі паважалі гэтыя мае якасці. Акрамя таго, я заўсёды сябравала з тымі, хто старэйшы за мяне гадоў на дзесяць. З імі было цікавей. Яны давалі мне чытаць модныя па тых часах кніжкі. Потым з'явілася кампанія альпіністаў і вулканолагаў. Мая мама, памятаю, перажывала: "Ці ж табе не хочацца апрануць сукенку, туфлі на высокім абцасе і пайсці ў рэстаран, у тэатр? Што ты цягаеш на сабе гэты цяжкі заплечнік у горы?" А мне падабалася гэтая самастойнасць. Дарэчы, альпіністы навучылі аднаму важнаму прынцыпу: "Сам гінеш, а сябра вызваляй з бяды". Для жыцця гэта вельмі каштоўнае ўменне — рабіць не толькі для сябе. Калі на чалавека можна абаперціся. Паверце, я такіх людзей ведаю нямала.


АРТУР ПРУПАС

## БІБЛІЯТЭКА ПАВІННА СТАЦЬ СІМВАЛАМ БЕЛАРУСІ, ЯК ЭЙФЕЛЕВА ВЕЖА СТАЛА СІМВАЛАМ ФРАНЦЫІ

*— Людміла Мітрафанаўна, Нацыянальная бібліятэка — ваш 105-гпы аб'ект. Тэта што-небудзь для вас значыць?*

— Гэты аб'ект, безумоўна, самы складаны. І атрымала я яго не простатак. Справаўтым, што ў многіх прафесіях пэўны час назіраўся разрыў пакаленняў. Засталіся або спецыялісты "у гадах", або зусім яшчэ маладыя, нявопытныя. І калі мне прапанавалі ўзначаліць гэты аб'ект, я ўзяла на сябе такую адказнасць, каб падтрымаць рэнамэ "Мінскпраекта", дзе працавала ўсё жыццё. Аб'ект, якому спатрэбілася 50 тамоў разліковай часткі, у Беларусі яшчэ не будавалі. Над разлікамі працавалі нашы выбітныя вучоныя: доктар тэхнічных навук, прафесар Цімафей Пяцольд, доктар тэхнічных навук, прафесар Дзмітрый Лазоўскі. Шчыра кажучы, на стадыі архітэктурнага праекта ніхто не верыў у яго ажыццяўленне. На паперы можна ажыццявіць любую фантазію. А вось як пабудаваць тое, што раней ніколі не будавалася? Не было нават вопыту па выкананні падобных разлікаў. Уяўляеце сабе шар з велізарнымі памяшканнямі пад кнігасховішчы?

Бібліятэка павінна стаць сімвалам Беларусі, як, напрыклад, Эйфелева вежа стала сімвалам Францыі. Вядома, такі размах прадвызначае наяўнасць не толькі кнігасховішча. Там будзе пляцоўка для агляду, бізнес-цэнтр, кавярня, месцы для адпачынку, паркінг. Шар — так будзе выглядаць кнігасховішча — самая кампактная ў прыродзе форма. У хуткім часе пад яго дахам размесціцца 8 мільёнаў кніг. Але ён разлічаны на 14 мільёнаў адзінак захоўвання. Самая галоўная вартасць нашага "брыльянта" — гэта своечасовая дастаўка кніг чытачу. У нядаўна пабудаванай Нацыянальнай бібліятэцы Францыі кнігу трэба чакаць гадзіну. А ў Беларусі яе даставяць спецыяльнымі ліфтамі за 20 хвілін. Гэты будынак будзе прадстаўляць нашу краіну ў інтэлектуальным свеце, стане яе гонарам.

Ганна **Шадрына**